# БЕРАСЦЕЙСКАЯ ЦАРКОЎНАЯ УНІЯ: ЗАКЛЮЧЭННЕ І НАСТУПСТВЫ

***А. І. Грышына***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт*

У 1569 г. згодна з актам Люблінскай уніі была створана канфедэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая, якая аб’яднала ВКЛ і Польшчу.

У канцы XVI ст. Рэч Паспалітая апынулася ў цяжкім становішчы: знешняя агрэсія суседніх краін спалучалася з унутрыпалітычнымі спрэчкамі і канфесійнай барацьбой. У гэтых умовах частка грамадства прапанавала сваю ідэю выхаду са стану варожасці – новую веру, якая б аб’яднала праваслаўных і католікаў, якая дапамагла б пазбавіцца прэтэнзій з боку Масквы і Варшавы, зрабіць незалежнай праваслаўную царкву Рэчы Паспалітай ад канстантынопальскага патрыярха, а таксама выратавала б народ ад грамадзянскай вайны, да якой у хуткім часе маглі прывесці рэлігійныя спрэчкі. У 1590 г. праваслаўны епіскап Львова Гедэон Балабан, раззлаваны бясконцымі спрэчкамі з брацтвам, паставіў пытанне пра унію з Рымам на таемнай сустрэчы праваслаўных епіскапаў у Белзі. Акрамя Балабана, разглядаць гэта пытанне згадзіліся Кірыла Тарлецкі з Луцка, Дыанісій Збіруйскі з Халма і Леонцій Пелчыцкі з Турава. Хутка да іх прымкнуў Іпацій Пацей, які разам з Кірылам Тарлецкім стаў на чале змовы епіскапаў за ўстанаўленне уніі. Яны заклікалі праваслаўных прыняць канцэпцыю уніі, выпрацаваную ідэолагамі каталіцызму і падпарадкаваную іх інтарэсам.

У «адправаслаўнай» канцэпцыі прадугледжвалася аб’яднанне ўсходняй і заходняй хрысціянскіх цэркваў дзеля аднаўлення і вяртання колішняй моцы першай, захаванне яе абрадаў і набажэнстваў. Каталікам жа забаранялася дамагацца зямельных уладанняў, якія належалі праваслаўным, схіляць у сваю веру праваслаўных. Праваслаўныя павінны былі атрымаць роўныя з каталікамі правы, мітрапаліт і епіскапы – права абірацца ў Сенат пасламі соймаў. Адной з асноўных умоў аб’яднання ў канцэпцыі, выпрацаванай астрожскім гуртком, з’яўляліся спробы схілення да уніі грэчаскай, маскоўскай і паўднёвай праваслаўных цэркваў. Акрамя таго, К. Астрожскі прапаноўваў аб’яднанне ў адну ўсіх канфесій ВКЛ (праваслаўнай, каталіцкай і пратэстанцкай).

У снежні 1594 г. Іпацій Пацей і Кірыла Тарлецкі ад імя праваслаўнай знаці склалі акт, у якім гаварылася, што яны маюць намер аб’яднацца з рымлянамі пад адным пастырам і што яны даюць абет старацца прывясці і духавенства, і народ да гэтага царкоўнага аб’яднання. Гэты акт падтрымала частка духавенства, але епіскапы Гедэон Балабан і Міхаіл Капысценскі не падпісалі гэты дакумент.

Вялікая частка праваслаўя выбухнула ад абурэння. У сярэдзіне 1595 г. праваслаўныя біскупы склалі і падпісалі два дакументы. Першы з іх – «Артыкулы уніі», у якім замацоўваліся ўмовы заключэння царкоўнага саюзу. Гэты дакумент быў адпраўлены кіраўніку дзяржавы і Папе Рымскаму. Другі акт – «Саборнае пасланне да папы». У ім змяшчалася просьба згадзіцца на унію з праваслаўнымі ў Рэчы Паспалітай.

У абодвух дакументах знаходзіліся патрабаванні «захаваць у дасканалай нязменнасці ўсе малітвы, абрады і цырымоніі» ўсходняй царквы, а таксама «адпраўляць багаслужэнні на нашай роднай мове». У лістападзе 1595 г. епіскапы Іпацій Пацей і Кірыла Тарлецкі прыехалі ў Рым на перамовы з рымскай курыяй і Папам Рымскім. 23 снежня 1595 г. Папа Клімент VIII благаславіў ідэю уніі, а ў студзені 1596 г. ён паставіў свой подпіс пад дакументам аб царкоўнай уніі, унёсшы пэўныя карэктывы ў дагавор.

Ідэя уніі канчаткова ажыццявілася ў 1596 г. на Берасцейскім царкоўным саборы. Беларусь і Украіна не бачылі раней такіх вялікіх збораў духавенства. Князь Астрожскі, епіскапы Балабан і Капысценскі адышлі ад ідэі аб’яднання цэркваў, хоць раней былі яе гарачымі абаронцамі. Нягледзячы на пагрозы з боку прадстаўнікоў праваслаўнага духавенства, 9 кастрычніка архіепіскап полацкі Рыгор у царкве Св. Міколы ўрачыста прачытаў напісаны на пергаменце тэкст уніі, абвясціўшы гэтым пастанову сабора. Берасцейская царкоўная унія з’явілася прававым актам, які юрыдычна замацаваў аб’яднанне каталіцкай і праваслаўнай цэркваў Рэчы Паспалітай у адну уніяцкую царкву на аснове пэўных кампрамісаў паміж імі. Новую веру назвалі уніяцкай. Вернікаў, якія прызналі гэты саюз, пачалі называць уніятамі.

Заключэнне Берасцейскай царкоўнай уніі выклікала вострую палеміку. Найвыдатнейшымі прыхільнікамі уніі выступілі Пётр Скарга, Іпацій Пацей, Іасафат Кунцэвіч, праціўнікамі – Канстанцін Астрожскі, Хрыстафор Філалет, Іван Вішэнскі, Мялецій Сматрыцкі, Афанасій Філіповіч.